УДК: 93/94

# ДРАЎЛЯНАЕ ДОЙЛІДСТВА ПАЛЕССЯ ЯК ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ БЕЛАРУСІ

***С. У. Грыбава***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт*
***А. С. Урбанская***
*студэнтка*
*Беларусь, Брэст, БрДТУ*

Артыкул прысвечаны даследаванню культавага драўлянага дойлідства Палесся. Распавядаецца аб архітэктурных стылях, якія аказалі ўплыў на яго фарміраванне, вылучаюцца і апісваюцца характэрныя асаблівасці архітэктуры Заходняга і Усходняга Палесся. Аўтары звяртаюць увагу на ўнікальнасць дадзенага культавага комплекса і яго гістарычную каштоўнасць.

*Ключавыя словы:* Беларускае Палессе, архітэктура, культавыя пабудовы, матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці.

Беларускае Палессе… Краем лясоў, гнілых балот і туманаў назваў некалі гэтую тэрыторыю, што раскінуліся на сотні кіламетраў ад Заходняга Буга да Дняпра на поўдні рэспублікі, народны паэт Беларусі Якуб Колас. Перасечаны мноствам вялікіх і малых рэк, моцна забалочаны, гэты нізінны лясны край у старажытнасці, здавался на першы погляд, быў нязручным для пражывання людзей. Аднак здаўна тут сяліліся людзі. Менавіта на Палессі ўпершыню на тэрыторыі Беларусі ў 6–8 стст. з’явіліся славянскія помнікі. Значнае месца займала Беларускае Палессе і ў структуры першай старажытнарускай дзяржавы – Кіеўскай Русі, бо па Прыпяці праходзіў важны гандлевы шлях, які звязаў Падняпроўе з Заходнім Бугам і Балтыйскім морам. Такім чынам, тут адбываліся значныя гісторыка-этнічныя і культурныя працэсы, якія абумовілі ўжо на ранняй ступені старажытнарускай гісторыі вялікі ўздым культуры і мастацтва [1, с. 5–6].

Драўлянае культавае дойлідства Беларусі сваімі каранямі ўзыходзіць да абарончых збудаванняў раннеславянскіх гарадзішч і дзядзінцаў. Менавіта там нарадзіліся шмат’ярусныя зрубныя канструкцыі, шатровыя завяршэнні, вежы і барабаны, якія атрымалі далейшае развіццё ў культавым дойлідстве [2, с. 72].

Хрысціянскае сакральнае дойлідства з’яўляецца адным з галоўных набыткаў сусветнай цывілізацыі і на працягу двух тысяч гадоў служыць духоўным і мастацкім стрыжнем еўрапейскай культуры. Сучаснае мастацтвазнаўства надае вялікую ўвагу вывучэнню архітэктурна-мастацкага стылю барока, які панаваў ва ўсім хрысціянскім свеце з канца 16 ст. па канец 18 ст. і пакінуў вялікую шматнацыянальную культурную спадчыну. Каштоўны ўнесак у гэтую скарбонку зрабіў і беларускі народ. Сакральнае дойлідства Беларусі мае сваю спецыфічную адметнасць, таму што яно фарміравалася на памежжы культурна-тэалагічнага супрацьстаяння каталіцтва і праваслаўя,

раскол якіх адбыўся на пачатку прыняцця нашымі продкамі хрысціянства. Трэба ўлічваць таксама і распаўсюджванне ўніяцтва з 16 ст. Гэта абумовіла складанасць эвалюцыі хрысціянства і самабытную інтэрпрэтацыю архітэктурна-мастацкіх стыляў, якія выпрацавала ў сваім развіцці еўрапейская мастацкая культура [3, с. 137].

Культавае дойлідства ў эпоху феадалізму з'яўлялася адной з важнейшых галін манументальнага будаўніцтва, дзякуючы той важнай ідэалагічнай ролі, якую адыгрывала рэлігія, калі ўсе важнейшыя сацыяльныя і культурныя рухі набывалі рэлігійную афарбоўку. У храмавых пабудовах выявіўся сапраўдны геній народных майстроў, якія стваралі пры дапамозе абмежаваных мастацкіх сродкаў здзіўляючыя прыгажосцю збудаванні, змаглі ўкласці ў іх усе тое, што не знайшло месца ў сціплым народным жыллі і гаспадарчых будынках. Тыя ж канструкцыйныя і мастацкія прыёмы, якія стагоддзямі выпрацоўваліся і ўдасканальваліся ў масавым народным будаўніцтве, у культавым дойлідстве былі развіты, даведзены да пластычнай дасканаласці. Старажытныя храмы ўяўляюць у многіх выпадках і своеасаблівыя сховішча помнікаў жывапісу, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Развіваючыся самастойным шляхам, драўлянае культавае дойлідства ўступала ў складаныя сувязі з міжнароднымі стылямі, што панавалі ў розныя эпохі ў мураванай архітэктуры. Першым стылем, які зрабіў уплыў на развіццё форм драўлянага культавага дойлідства, быў візантыйскі. Готыка і рэнесанс не выліліся ў Беларусі ў буйныя мастацкія напрамкі, якія ахоплівалі б усю сукупнасць з'яў у нацыянальным мастацтве. Таму відаць і не зрабілі вялікага ўплыву на драўлянае дойлідства. Верагодна, пад уплывам готыкі сфарміраваўся тып храма са званіцай. Рэнесанс галоўным чынам унес змены ў інтэр'ер храма, узбагаціўшы яго пластыку сакавітай разьбой іканастаса, замяніў візантыйскую шаломападобную галаву купальнай, увеў рызны карніз і некаторыя іншыя дэкаратыўныя дэталі.

Асабліва глыбокае ўздзеянне на культавае драўлянае дойлідства зрабіў стыль барока, развіцце якога супала з пад'емам нацыянальнай самасвядомасці і актывізацыяй мастацкай дзейнасці шырокіх слаеў народа [4, с. 82–83].

У пачатку XIX – пачатку XX стст. адбываецца шэраг змен у развіцці драўлянага царкоўнага дойлідства Беларусі. Пачаліся яны ў першай чвэрці мінулага стагоддзя ў сувязі з ліквідацыяй уніяцтва. Былыя ўніяцкія цэрквы перабудоўваюцца з мэтай надання ім выгляду, які б адпавядаў праваслаўнай царкве. У большасці выпадкаў такія рэканструкцыі зводзіліся да прыбудовы трох-чатырох'ярусная званіцы са стромкім шатровым завяршэннем і цыбулістай главкай. Часта такія прыбудовы парушалі кампазіцыйную раўнавагу царквы [5, с. 13].

Аналіз прыёмаў і архітэктурных формаў, праведзеных з улікам уплыву мастацкіх стыляў і каменнага дойлідства, дазваляе выявіць у архітэктуры драўляных цэркваў розных раёнаў Беларусі асаблівасці, у якіх праглядаюцца рэгіянальныя адрозненні народнага дойлідства.

Асноўны тып цэркваў Заходняга Палесся – падоўжна-восевая кампазіцыя, якая магла выходзіць за межы нават кананічнай трохсрубнай структуры ў сувязі са з'яўленнем на восі чацвёртага зруба. Цэрквы заходняй часткі гэтага рэгіёна характарызуюцца цэльнасцю аб'ёму, а ва ўсходняй частцы атрымалі распаўсюджванне царквы з самастойным завяршэннем кожнага зруба, што ў значнай меры садзейнічала развіццю сілуэтных кампазіцый.

Ва Усходнім Палессі больш вядомыя трохсрубныя ярусна-восевыя цэрквы. Развіваліся і цэнтрычныя пабудовы, заснаваныя на выдзяленні цэнтральнага зруба. Яны былі пяцісрубнымі і адрозніваліся ад аналагічных ў Заходнім Палессі больш развітымі аб'ёмнымі рашэннямі, але саступалі такім пабудовам у Паазер'і і Падняпроўі ў арганізацыі інтэр'еру цэнтрычнай структуры, застаючыся пад уплывам панавалых у культавым дойлідстве Палесся падоўжна-восевых рашэнняў з вялікім імкненнем да сілуэтнасці [6, с. 442–443].

Адметнай асаблівасцю беларускай драўлянай царквы ў параўнанні з сакральным драўляным дойлідствам Расіі з'яўляецца фарміраванне алтарнай часткі пяцікутнай формы. У драўляных цэрквах сярэдняй і паўночнай Расіі з'яўляецца фарміраванне алтарнай часткі пяцікутнай формы. У драўляных цэрквах сярэдняй і паўночнай Расіі бытавалі звычайныя чатырохкутныя алтары-трысцены. Будаўніцтва з брусоў, у чысты вугал, дазваляла ствараць шматкутныя пластычныя формы лягчэй, чым пры злучэнні ў вугал з астаткам [5, с. 8].

Драўлянае дойлідства Палесся ў асноўным прадстаўлена ўнікальнымі храмамі. Драўляныя цэрквы – з'ява самабытная. Двух аднолькавых старадаўніх храмаў няма. Будаваліся цэрквы з самага тады таннага матэрыялу – лесу, недахопу ў якім на Палессі не было. І цяпер застаецца толькі здзіўляцца, як яны захаваліся, нягледзячы на далікатнасць і гаручасць матэрыялу, з якога былі ўзведзены. Але і сёння культавыя збудаванні, як і некалькі стагоддзяў таму радуюць нас сваей вытанчанасцю, веліччу і прастатой. Толькі у Брэсцкай вобласці налічваецца 112 культавых збудаванняў з дрэва, 88 з якіх уяўляюць асаблівую цікавасць. Прычым, многія з іх былі ўзведзены ў 16–18 стагоддзях. Трэба адзначыць, што драўлянае культавае дойлідства Палесся з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю і знаходзіцца пад аховай дзяржавы.

Вельмі важна зберагчы культавыя пабудовы драўлянага дойніцтва ў іх першасным выглядзе. На жаль, многія культавыя збудаванні губляюць сваю спрадвечнасць. Мяняюцца інтэр'еры і знешні выгляд. Так, з храма вёскі Вялемічы Драгічынскага раёна (самая вялікая царква на Палессі) знялі крыжы XVII ст. і ўсталявалі новыя. Вакол старадаўніх храмаў з'яўляюцца бетонныя платы. А некаторыя цэрквы абіваюць сайдынгам, як у Хацiславе Маларыцкага раёна.

Згодна са сваімі якасцямі матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія ўключаны ў Дзяржаўны спіс, падзяляюцца на чатыры катэгорыі: "0"– гісторыка-культурныя каштоўнасці сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны; "1" – найбольш унікальныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, мастацкія, эстэтычныя і дакументальныя вартасці якіх уяўляюць міжнародны інтарэс; "2" – славутыя гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія

характарызуюць найбольш адметныя рысы гісторыка-культурнай спадчыны ўсёй рэспублікі; “3” – гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія характарызуюць адметныя рысы гісторыка-культурнай спадчыны асобных рэгіёнаў рэспублікі. Трэба заўважыць, што драўлянае культавае дойлідства Палесся адносіцца да “0” катэгорыі. Асаблівай унікальнасцю, з пункту гледжання даследчыкаў, адрозніваюцца такія цэрквы як: Міхайлаўская царква са званіцай 1701 г. у в. Чэрск (Брэсцкі раён) (фота 1), Мікіцкая царква са званіцай в. Здітава (Жабінкоўскі раён, пабудавана ў 1502, год апошняй перабудовы 1787) (фота 2), Царква Параскевы Пятніцы са званіцай 1740 г. у в. Дзівін (Кобрынскі раён) (фота 3), Царква ў імя святой вялікапакутніцы Параскевы Пятніцы ў в. Збірагі (Брэсцкі раён, 1610 г.) (фота 4), Царква ў імя святога архангела Міхаіла ў в. Сцяпанкі (Жабінкоўскі раен, 1780 г.) (фота 5).



*Фота 1* – Міхайлаўская царква, в. Чэрск



*Фота 2* – Мікіцкая царква, в. Здітава



*Фота 3* – Царква Параскевы Пятніцы, в. Дзівін



*Фота 4* – Царква ў імя святой Вялікапакутніцы Параскевы Пятніцы, в. Збірагі



*Фота 5.* Царква ў імя святога архангела Міхаіла, в. Сцяпанкі

Такім чынам, можна канстатаваць, што культавае драўлянае дойлідства Палесся – гэта ўнікальная з’ява, якая адлюстроўвае пэўныя характарыстыкі рэлігійнага жыцця рэгіена, мае самабытную архітэктурную афарбоўку, у якой можна вызначыць агульныя тэндэнцыі, але аднолькавых пабудоў знайсці немагчыма. А некаторыя цэрквы, нягледзячы на гаручасць і нетрываласць матэрыяла, захаваліся да нашых дзен з 16–18 стст. Вельмі важна захаваць і зберагчы гэтую спадчыну для далейшых пакаленняў. Можна меркаваць, што некаторыя цэрквы могуць прэтэндаваць на ўключэнне ў Спіс аб’ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Спіс крыніц і літаратуры:

1. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся : 17–19 стст. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 152 с.

2. Лакота, А. І. Народнае дойлідства / А. І. Лакота. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 200 с.

3. Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце. / А. І. Лакотка [ і інш.]; навук . рэд. А. І. Лакотка. – У 4 т. – Т. 2. – XV–XVII стст. – Мінск : Беларуская навука, 2006. – 626 с.

4. Якімовіч, А. Ю. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся : 17–19 стст. / А. Ю. Якімовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 152 с.

5. Лакотка, А. І. Драўлянае сакральна-манументальнае дойлідства Беларусі / А. І. Лакотка. – Мінск : Беларусь, 2003. – 224 с.

6. Сергачев, С. А. Народное зодчество Беларуси. История и современность / С. А. Сергачев. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2015. – 560 с.